**15.06.2020**

**Транспартная інспекцыя спыняе велікагрузы з пломбамі**

У пачатку чэрвеня ўступіла ў сілу пастанова ўрада №311 ад 25 мая 2020 года "Аб прымяненні навігацыйных прылад (пломбаў)». Цяпер адсочваць перамяшчэнне транспартных сродкаў па тэрыторыі Беларусі можна ў рэжыме рэальнага часу. Згодна з нарматыўна-прававым актам, Транспартная інспекцыя працуе ў звязку з прадстаўніком нацыянальнага аператара на беларуска-расійскім участку дзяржаўнай мяжы і спыняе велікагрузы, якія апасля на наяўнасць парушэнняў правярае аператар.

На сённяшні дзень спецыялісты інспекцыі спынілі больш за 1,2 тыс. транзітных транспартных сродкаў, шлях следавання якіх знаходзіўся пад асаблівым кантролем. Разам з тым, Транспартная інспекцыя працягвае кантраляваць выкананне вадзіцелямі-міжнароднікамі патрабаванняў пастановы Саўміна № 171. З пачатку дзеяння пастановы ў дачыненні да 241 перавозчыка вядуцца адміністрацыйныя працэсы.

Нагадваем, свае маршруты кіроўцы-міжнароднікі павінны будаваць з улікам устаноўленых транспартных калідораў, спыняцца толькі ў пазначаных месцах і не пакідаць тэрыторыю месца знаходжання падчас стаянкі.